Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 275 (344)

ПЯТНІЦА 29 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:



## УСЯМЕРНА ЎМАЦОЎВАЦЬ ГРАМАДСКУЮ ГАСПАДАРКУ КАЛГАСАЎ

Грамадская ўласнасць — аснова калгаснага ладу. Чым лепш, прадукцыйней развіваецца грамадская калгасная гаспадарка, тым хутчэй павышаецца дабрабыт, заможнасць усіх калгаснікаў, тым больш багацце прадуктаў атрымоўвае савецкая краіна. У калгаснікаў ёсць адзін верны шлях да далейшага паляпшэння свайго жыцця — гэта шлях умацавання калгаса, грамадскай уласнасці арцелі.

Большэвіцкая партыя, совецкі ўрад, таварыш Сталін праяўляюць найвялікшыя клопаты аб умацаванні грамадскай арцельнай гаспадаркі, аб развіцці і ахове калгаснай уласнасці. Гэтыя клопаты аб калгасах сказаліся ў навядзенні большэвіцкага парадку на калгаснай зямлі, якая з'яўляецца асновай грамадскай гаспадаркі арцелі, і ў змяненнях у палітыцы загатозак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў. Сталінскія клопаты калгасы адчуваюць штодзённа.

Калгасам створаны ўсе ўмовы для бесперапыннага павелічэння арцельнага багацця. Усе калгасы маюць магчымасць павышаць ураджай, завадзіць прадукцыйную малочную жывёлу, добрых коней, птушку, свіней, авечак, ставіць грамадскія будоўлі, эфектыўна выкарыстаць разнастайныя галіны сваёй вытворчасці. Усё гэта багацце належыць калектыўнай гаспадарцы, людзям, якія яго ствараюць. Гэтае багацце ідзе на развіццё і ўмацаванне сацыялістычнага будаўніцтва, на павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працаўнікоў вёскі.

На канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў таварыш Сталін гаварыў аб тым, што дробная сялянская гаспадарка ў сваёй масе не толькі не ажыццяўляе штогодна расшыранага ўзнаўлення, але не заўсёды мае магчымасць ажыццяўляць нават простае ўзнаўленне.

У рэзультаце перамогі калгаснага ладу сельская гаспадарка ў нашай краіне, узброеная навейшай тэхнікай, развіваецца на аснове расшыранага соцыялістычнага ўзнаўлення. Калгаснае сялянства цвёрда і ўпэўнена ідзе па шляху далейшага росквіту соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. З кожным годам расшыраюцца пасевы ў калгасах, расце ўраджайнасць, таварнасць арцельнай вытворчасці, павялічваецца стада грамадскай жывёлы і яе прадукцыйнасць. Штогодна павышаюцца накапленні ў калгасах, дазваляючыя ім няўхільна рухацца ўперад сваю гаспадарку. Крыніцай гэтых накапленняў з'яўляюцца грамадскія арцельныя фонды.

Калгасы маюць непадзельныя фонды. Згодна статута сельгасарцелі, яны папаўняюцца штогодна. Па рашэнню Соўнаркома Саюза ССР і ЦК ВКП(б) ад 4 снежня 1938 года калгасы павінны адлічаць на папаўненне сваіх непадзельных фондаў: у зерневых раёнах — не менш 12, але не больш 15 процантаў, а ў раёнах тэхнічных культур і жывёлагадоўчых — не менш 15, але не больш 20 процантаў ад грашовых даходаў арцелі. Непадзельныя фонды — магутны сродак для далейшага ўздыму грамадскай калгаснай гаспадаркі. Маючы такія фонды, калгасы могуць бесперапынна расшыраць арцельную ўласнасць, памнажаць яе.

Грамадская гаспадарка калгасаў расце і ўмацоўваецца. Павялічваюцца і грашовыя даходы калгасаў. У 1939 годзе, напрыклад, грашовыя даходы ў калгасах узраслі больш чым на 1 мільярд 758 мільёнаў рублёў — падняліся з 16 мільярдаў 604 мільёнаў у 1938 годзе да 18 мільярдаў 362 мільёнаў рублёў у мінулым годзе. У 1933 годзе яны склалі ўсяго 5 мільярдаў 661 мільён 900 тысяч рублёў.

Хаця вынікі бягучага сельгаспадарчага года канчаткова яшчэ не падведзены, але адно несумненна: даходы калгасаў, у тым ліку і грашовыя, значна павялічыліся. Гэты год прайшоў у вёсцы пад знакам бурнага развіцця ўсіх галін калгаснай вытворчасці, што дабратворна сказалася на росце калгасных даходаў.

Інтарэсы грамадскай гаспадаркі патрабуюць сістэматычнага накаплення грамадскіх сродкаў калгаса і правільнага выкарыстання гэтых сродкаў для таго, каб «рухаць справу з умацаваннем калгасаў далей, пераводзячы іх на больш высокую ступень грамадскай гаспадаркі» (Андрэеў). Многія і многія калгасы так іменна і паступаюць.

Аднак, як паказваюць факты, некаторыя калгасы парушаюць артыкул 12 статута сельгасарцелі аб утварэнні непадзельных калгасных фондаў. Яны зусім не папаўняюць непадзельныя фонды або-ж робяць адлічэнні ніжэй нормы, прадугледжаных статутам і рашэннем партыі і ўрада.

Асабліва сур'ёзныя парушэнні статута сельгасарцелі былі допушчаны ў калгасах Узбекскай ССР. На 1 студзеня 1940 года калгасамі Узбекістана былі недаўнесены ў непадзельныя фонды вялікія сумы. Значная частка сродкаў не была ўнесена ў непадзельныя фонды к таму часу і калгасамі Краснадарскага края.

Парушэнні статута сельгасарцелі былі допушчаны таксама ў некаторых калгасах Іванаўскай, Варонежскай, Маскоўскай і Валагодскай абласцей, Таджыкскай і Беларускай ССР, у Чувашскай і Удмурцкай АССР.

У радзе калгасаў у непадзельныя фонды залічваюць нягодны дробны інвентар, рознае абсталяванне і матэрыялы, не прадстаўляючыя часам ніякай каштоўнасці, а таксама безнадзейныя даўгі за рознымі асобамі і ўстановамі. У калгасе «20 год Кастрычніка», Добрынскага раёна, Варонежскай вобласці, у непадзельным фондзе лічыцца звыш 16 тысяч рублёў, а ў сапраўднасці гэтых грошай на бягучым рахунку калгас не мае. Яны лічацца за рознымі асобамі або-ж выкарыстаны не па назначэнню. Гэта адбіваецца на грамадскай гаспадарцы арцелі. У гэтым калгасе нехапае сродкаў на пакупку жывёлы, на будаўніцтва памяшканняў і на іншыя грамадскія патрэбы.

Некаторыя калгасныя кіраўнікі, ідучы на повадзе ў адсталых калгаснікаў, разбазарваюць даходы арцелі, гоняцца ва ўрон грамадскай гаспадарцы за высокімі выдачамі на працадні, зусім не клапоцячыся аб тым, што ў такім калгасе жывёлагадоўчыя фермы не развіваюцца, грамадскія будоўлі дрэнныя, сельскагаспадарчыя машыны і прылады зношаны. Усё гэта падрывае грамадскую гаспадарку калгасаў, тармозіць далейшы рост даходнасці арцелей і заможнасці калгаснікаў. Калгас, які праядае ўсё атрыманае ім багацце, не мае накапленняў, не ў стане расшырыць арцельную гаспадарку, не можа рухацца ўперад.

Чаму сталі магчымымі падобныя факты? Некаторыя мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі ўсё яшчэ нездавальняюча кіруюць сельскай гаспадаркай. Будучы дрэнна звязаны з калгасамі, яны не ведаюць, што там адбываецца. Яны не стаяць на варце грамадскай уласнасці калгасаў, не сочаць за захоўваннем статута сельгасарцелі, праходзяць міма выпадкаў разбазарвання грамадскіх калгасных фондаў, не даюць належнага адпору антыкалгасным рвацкім настроям, якія ёсць ў асобных калгасах. Некаторыя мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі, як відаць, забылі, што грамадскія фонды з'яўляюцца важнейшай крыніцай умацавання калгаснай гаспадаркі і што грубейшыя скажэнні ва ўтварэнні і выдаткаванні гэтых фондаў наносяць сур'ёзны ўрон далейшаму развіццю грамадскай гаспадаркі і соцыялістычнаму накапленню ў калгасах.

Гэтыя факты раскрадвання грамадскіх калгасных фондаў сталі магчымымі таксама таму, што зямельныя органы не сочаць за захоўваннем статута сельгасарцелі, папушчаюць парушэнням яго.

Людзі, якія не даражаць грамадскай гаспадаркай, імкнуцца абыйсці статут сельгасарцелі, урэзаць непадзельныя фонды, дапускаюць разбазарванне непадзельных фондаў, павінны прыцягвацца да найстражэйшай партыйнай і судовай адказнасці.

Усебаковае развіццё гаспадаркі павялічвае даходы калгасаў. Гэтыя даходы выраслі у гэтым годзе настолькі, што калгасы цалкам могуць і абавязаны аднавіць сродкі ў непадзельныя фонды, недаўнесеныя імі ў 1938 і 1939 годах: палову налічваючайся сумы—з даходаў 1940 года і астатнюю частку—з даходаў 1941 года. Калгас, які не выконвае парадку стварэння і хавання непадзельных фондаў, раскрадвае гэтыя фонды, не мае права на атрыманне дзяржаўных крэдытаў. Установы Дзяржбанка і Сельгасбанка заклікаваны не толькі берагчы калгасныя каштоўнасці, але і ажыццяўляць строгі кантроль за правільным выдаткаваннем іх, ахоўваючы інтарэсы грамадскай арцельнай гаспадаркі.

1940 год з'яўляецца годам далейшага ўмацавання калгасаў, новага росту арцельных даходаў. Калгасы сабралі высокія ўраджаі ўсіх сельскагаспадарчых культур. Яны атрымалі таксама вялікія даходы ад новых галін сваёй вытворчасці, якім раней удзялялі недастатковую ўвагу.

Калгасная вёска падводзіць вынікі багатага года. Прыступаючы да размеркавання даходаў, калгасы павінны паклапаціцца перш за ўсё аб інтарэсах грамадскай гаспадаркі, стварыць арцельныя фонды ў поўнай адпаведнасці са статутам арцелі і ўказаннямі партыі і ўрада.

Размеркаванне даходаў — важная і адказная справа. Мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі абавязаны паўсядзённа і канкрэтна кіраваць ёю, дапамагаць калгасам правільна распараджацца сваімі даходамі, забяспечыць у калгасах дакладнае захоўванне норм адлічэнняў у непадзельныя фонды, установіць строгі кантроль за іх правільным выкарыстаннем.

Бязмежны магчымасці, якія тоіць у сябе калгасны лад. Невычарпальны рэзервы для павышэння калгасных даходаў. Максімальна выцягваючы ўсе выгады з кожнага гектара зямлі, большэвікі, кіраўнікі мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, калгаснікі могуць і павінны зрабіць кожную сельскагаспадарчую арцель высокадаходнай, культурнай гаспадаркай. Тады будуць расці і грашовыя даходы, а значыць і бесперапынна павышацца арцельныя накапленні, і калгасы з кожным годам будуць дабівацца ўсё новых, усё больш буйных поспехаў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

**(Перадавы артыкул «Праўды» за 27 лістапада 1940 г.)**

## У ЦК КП(б) Беларусі

16 лістапада ЦК КП(б) Беларусі разгледзеў пытанне аб рабоце шкляной прамысловасці рэспублікі і ўстанавіў, што ў рэзультаце нездавальняючага кіраўніцтва Наркамлегпрома БССР шкляная прамысловасць рэспублікі з месяца ў месяц не выконвае планаў выпуску прадукцыі. За прайшоўшыя 9 месяцаў 1940 года план выканан усяго на 45,6 проценту, недададзена прадукцыі на 5 мільёнаў рублёў. Не лічачыся з інтарэсамі народнай гаспадаркі, дырэктары шкляных заводаў сістэматычна парушаюць план па асартыменту, асабліва па лямпаваму шклу і шклянках.

На асобных шклозаводах («Ноўка», «Кастрычнік») бой і брак дасягае больш 50 процантаў. Асабліва дрэнна з прадукцыйнасцю працы. З агульнай колькасці рабочых здзельшчыкаў толькі 17 процантаў выконваюць устаноўленыя нормы. Наркамат не ўнікаў у работу Шклоўпраўлення. Бесперапынная цякучасць кіруючых кадраў на заводах, частая змена кіраўнікоў Упраўлення прывялі да паслаблення кіраўніцтва заводамі з боку Шклоўпраўлення.

ЦК КП(б)Б адзначыў нездавальняючае кіраўніцтва работай шклозаводаў з боку Барысаўскага, Бабруйскага, Суражскага, Быхаўскага і Асіпавіцкага райкомаў КП(б)Б, якія ўстараніліся ад паўсядзённага кіраўніцтва і кантролю за работай гэтых прадпрыемстваў. Гэта прывяло да таго, што шклозавод «Кастрычнік», Асіпавіцкага раёна, выканаў план на 39,2 проценту, завод «Ноўка», Суражскага раёна,—на 38,8 проценту, імені Дзержынскага—горад Барысаў—на 55,4 проценту, завод «Ільіч», Быхаўскага раёна,—на 57,9 проценту.

ЦК КП(б)Б указаў наркому лёгкай прамысловасці тав. Кургану і намесніку наркома тав. Астаф'еву на нездавальняючае кіраўніцтва шкляной прамысловасцю і абавязаў іх прыняць неадкладныя меры для ўстанаўлення на шкляных заводах цвёрдай тэхналагічнай дысцыпліны, укамплектавання заводскіх лабараторый кваліфікаванымі кадрамі і неабходным абсталяваннем. ЦК КП(б)Б абавязаў Наркамат лёгкай прамысловасці прыняць меры к паляпшэнню работы Шклоўпраўлення.

У мэтах расшырэння выпуску высокамастацкіх шкляных вырабаў на Нёманскім заводзе, прапанавала Наркамату лёгкай прамысловасці ўзяць пад свой нагляд работу гэтага завода. Дзяржплану БССР і Наркамлегпрому прапанавана прадугледзець у плане 1941 года водпуск сродкаў на пабудову вузкакалейных пуцей на шклозаводах імені Дзержынскага, «Ноўка» і «Комінтэрн». Для пакрыцця недастаючых абаротных сродкаў Наркамфіну БССР і Наркамлегпрому прапанавана выдзеліць Шклоўпраўленню 1 мільён рублёў дадатковых абаротных сродкаў. Намечан рад мерапрыемстваў па паляпшэнню снабжэння шклозаводаў палівам, хімікатамі.

ЦК КП(б)Б абавязаў сакратароў Суражскага, Быхаўскага, Бабруйскага і Асіпавіцкага райкомаў КП(б)Б, Барысаўскі гарком КП(б)Б прыняць меры к устараненню недахопаў у рабоце шкляных заводаў і ўзмацненню партыйна-палітычнай работы на прадпрыемствах. ЦК КП(б)Б абавязаў першых сакратароў райкомаў паўсядзённа ўнікаць у работу шкляных заводаў, сачыць за работай кожнага прадпрыемства паасобку і прымаць меры к устараненню недахопаў.

ЦК КП(б)Б патрабуе ад дырэктараў і партыйных арганізацый шклозаводаў у найкарацейшы тэрмін навесці большэвіцкі парадак на прадпрыемствах, прыняць меры к неадкладнаму правядзенню ў жыццё Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня 1940 года, пакончыць з патарпай да тэхналогіі, устанавіць найстражэйшае захоўванне тэхналагічнай дысцыпліны.

Задача партыйных арганізацый шклозаводаў заключаецца ў тым, каб, падтрымліваючы і распаўсюджваючы вопыт перадавых рабочых шкляной прамысловасці,—дабіцца безумоўнага выканання вытворчай праграмы.

## Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадского Совета дэпутатаў працоўных

91. Па акрузе **№ 37** зарэгістравана Марыя Сямёнаўна **Вайцэхоўская,** 1896 года нараджэння, беспартыйная, прысучалка 2-га тэкстыльнага камбіната, вылучана калектывам 2-га камбіната.

92. Па акрузе **№ 38** зарэгістравана Паўліна Іосіфаўна **Майсюк,** 1901 года нараджэння, беспартыйная, памочнік майстра прадзільнага аддзела 2-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам гэтага-ж камбіната.

93. Па акрузе **№ 39** зарэгістраван Ноах Майсеевіч **Гершковіч,** 1912 года нараджэння, беспартыйны, ткач тэкстыльнага камбіната № 2, вылучаны калектывам рабочых і служачых тэкстыльнага камбіната № 2.

94. Па акрузе **№ 40** зарэгістраван Іосіф Антонавіч **Маславіцкі,** 1907 года нараджэння, беспартыйны, рабочы камбіната № 2, вылучаны калектывам гэтага-ж камбіната.

95. Па акрузе **№ 45** зарэгістравана Марыя Аляксандраўна **Галенка,** 1917 года нараджэння, член ВЛКСМ, студэнтка, вылучаная калектывам студэнтаў і настаўнікаў педагагічнага вучылішча і рабфака.

96. Па акрузе **№ 49** зарэгістраван Іван Грыгор'евіч **Краскевіч,** 1911 года нараджэння, беспартыйны, настаўнік школы № 12, вылучаны калектывам работнікаў школ №№ 18, 12, 4, 21 і 9.

97. Па акрузе **№ 50** зарэгістраван Мечыслаў Емельянавіч **Ельскі,** 1912 года нараджэння, беспартыйны, ткач тэкстыльнай фабрыкі № 12, вылучаны калектывам гэтай-жа фабрыкі.

98. Па акрузе **№ 55** зарэгістравана Ольга Фёдараўна **Карнітоўская,** 1905 года нараджэння, беспартыйная, работніца тэкстыльнага камбіната № 13, вылучаная калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых гэтага-ж камбіната.

99. Па акрузе **№ 57** зарэгістраван Владзімір Іванавіч **Шымко,** 1905 года нараджэння, беспартыйны, брыгадзір пякарні № 3, вылучаны калектывам хлебакамбіната.

100. Па акрузе **№ 58** зарэгістравана Соф'я Якаўлеўна **Ермаловіч,** 1919 года нараджэння, член ВЛКСМ, загадчык лабараторыяй, вылучаная калектывам хлебакамбіната.

## Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Ломжынскага гарадского Совета

Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у гарадскі Совет заканчваюць рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты гарадского Совета.

Акруговая выбарчая камісія 17-й акругі зарэгістравала кандыдатам у дэпутаты стаханаўца-ліцейшчыка завода сельскагаспадарчых машын Іпаліта Цімафеевіча Кіндэрскага. Акруговая выбарчая камісія 24-й акругі зарэгістравала машыніста ломжынскай электрастанцыі Чэслава Францавіча Геміпэўскага, вылучанага рабочымі і служачымі электрастанцыі. Па 27-й выбарчай акрузе зарэгістраваны дырэктар школы № 1 горада Ломжы Канстанцін Іванавіч Трачэўскі, вылучаны агульным сходам настаўнікаў горада. Тав. Трачэўскі адзін з самых здольных настаўнікаў, добра ведаючых сваю справу.

**П. Грышчанка.**

## Урачыстыя вечары, прысвечаныя памяці Адама Міцкевіча

ЛОМЖА. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** 26 лістапада ў Ломжынскім гарадскім тэатры адбыўся агульна-гарадскі вечар, прысвечаны памяці вялікага паэта. З дакладам аб жыцці і дзейнасці Міцкевіча выступіў настаўнік першай сярэдняй школы тав. Ісак. Яго змястоўны даклад, насычаны фактамі і прыкладамі з творчасці вялікага польскага паэта, быў праслуханы прысутнымі з велізарнай увагай і цікавасцю.

Пасля даклада з вялікай мастацкай праграмай выступілі вучні школ №№ 1, 6, 7. Яны паказалі літаратурны мантаж і інсцэніроўкі з раду твораў паэта.

На вечары прысутнічала звыш 800 чалавек.

* * *

ВАЎКАВЫСК. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** Грамадскасць Ваўкавыскага раёна шырока адзначыла 85-ю гадавіну з дня смерці геніяльнага польскага паэта Адама Міцкевіча. На прадпрыемствах, ва ўстановах і школах праведзены гутаркі аб жыцці і творчасці вялікага паэта і аб яго дружбе з А. С. Пушкіным і дзекабрыстамі.

26 лістапада адбыўся літаратурны вечар у чыгуначнай школе. На вечары прысутнічала каля 800 чалавек вучняў, настаўнікаў і бацькоў. Пасля даклада аб творчасці і рэвалюцыйна-дэмакратычнай дзейнасці Міцкевіча, сіламі вучняў старшых класаў былі пастаўлены 4 інсцэніроўкі балад паэта.

Такія-ж вечары былі праведзены амаль ва ўсіх сярэдніх і няпоўнасярэдніх школах Ваўкавыскага раёна.

Жыццю і творчасці паэта вучні прысвяцілі спецыяльныя нумары школьных насценных газет.

## Па Совецкай краіне


### ПАРАДАК НАЗНАЧЭННЯ СТЫПЕНДЫЙ Імені В. М. МОЛАТАВА

Соўнарком Саюза ССР зацвердзіў палажэнне аб парадку назначэння стыпендый імені таварыша В. М. Молатава.

Гэтыя стыпендыі назначаюцца найбольш выдаючымся студэнтам—выдатнікам вышэйшых навучальных устаноў. Кандыдаты вылучаюцца советамі вузаў, ВНУ (вышэйшых навучальных устаноў), а назначэнне ўтвараецца народнымі камісарамі ці кіраўнікамі цэнтральных устаноў па прыналежнасці. Пазбаўленне навучаючыхся ВНУ стыпендый імені таварыша В. М. Молатава дапускаецца толькі з зацвярджэння адпаведнага наркома ці кіраўніка цэнтральнай установы.

Як вядома, усяго ўстаноўлена ў азнаменаванне 60-годдзя тав. Молатава 300 стыпендый па 400 рублёў у месяц кожная, для студэнтаў 6 вышэйшых навучальных устаноў Ленінграда, Казані, Кірава і Молатава.

(ТАСС).



На будаўніцтве Салікамскага цэлюлозна-папяровага камбіната (Молатаўская вобласць).

На здымку: магутны кабелькран. На працягу сутак кран можа выгрузіць 2,5 тысячы кубаметраў драўніны.

Фота В. Наскова.

Фота-кліша ТАСС.

### КОМСАМОЛЬСКІ ПАВЕТРАНЫ ДЭСАНТ

Маскоўскае падраздзяленне Грамадзянскага паветранага флота рыхтуецца правесці вялікія ваенна-паветраныя тактычныя заняткі. У праграму гэтых заняткаў уключан, у прыватнасці, парашутны дэсант. Правесці гэты дэсант узяліся комсамольцы падраздзялення.

20 комсамольцаў - парашутыстаў дапрызыўнага ўзросту правялі першую трэніроўку. У 2 гадзіны дня з аэрадрома ў Маскве падняўся самалёт «ПС-84», у якім знаходзіліся дэсантнікі. Неўзабаве гэты самалёт ужо быў у раёне падмаскоўнай станцыі Быкава. Па камандзе начальніка дэсанта майстра парашутнага спорта СССР тав. Егорава, парашутысты адзін за другім скідваліся з самалёта ў раней намечаныя месцы. Не гледзячы на тое, што выкідка дэсанта адбывалася ў вельмі неспрыяючых метэаралагічных умовах, усе парашутысты па ацэнцы камандавання выдатна справіліся з заданнем.

Выкідка дэсанта адбывалася з вышыні 600 метраў.

# КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

***Выбаршчыкі Свіслацкай выбарчай акругі № 82! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Нікалая Іванавіча ГРЫБАЕДАВА!***

★ ★ ★

## Нікалай Іванавіч Грыбаедаў

(***БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС***)

Нікалай Іванавіч Грыбаедаў нарадзіўся ў 1898 годзе, у вёсцы Масюкі, Аршанскага раёна, Віцебскай вобласці. Бацька яго быў батраком. Пасля руска-японскай вайны ён прыкупіў два з чвэрцю гектары зямлі, раскінутай у 40 палосках. Сям'я была вялікая, і каб пракарміцца, дзесяцігадовы Коля разам з бацькам ішоў батрачыць за грывенік у дзень.

У час першай імперыялістычнай вайны бацьку забралі ў салдаты, а пад канец вайны мабілізавалі і Нікалая Іванавіча. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі разам з усёй старой арміяй вярнуўся дамоў Нікалай і 9 студзеня 1918 года ўступіў добраахвотнікам у Чырвоную гвардыю.

Сваё баявое хрышчэнне малады чырвонагвардзеец атрымаў у барацьбе з белапалякамі. На тэрыторыі Беларусі сфарміраваўся тады контррэвалюцыйны польскі корпус пад камандай царскага генерала Доўбар-Мусніцкага. Адна з брыгад гэтага корпуса стаяла ў Ельне, Смаленскай губерні. Туды накіроўваецца са сваім атрадам Нікалай Іванавіч, які камандуе ўзводам. Чырвонагвардзейцы цяснілі белых легіянераў да Рагачова і разбілі іх між Рагачовам і Бабруйскам.

1919 год. Юдзеніч пагражае сэрцу рэвалюцыі — чырвонаму Піцеру. Нікалай Іванавіч на паўночна-заходнім фронце. Ён камандуе ротай, а затым батальёнам, які складаўся ў сваёй большасці з маскоўскіх чыгуначнікаў. Белыя рушылі супроць гэтага палка свае лепшыя часці — афіцэрскія батальёны. Марознай ноччу, па выпаўшаму сняжку, пайшлі афіцэры ў атаку. Бой працягваўся да золаку. Раніцой чырвоныя атакавалі белых. У пераможных баях полк гнаў праціўніка ад Ленінграда да самай Нарвы.

У 1922 годзе Нікалай Іванавіч па хваробе звальняецца з Чырвонай Арміі. Пачынаецца другі перыяд яго жыцця — перыяд дзяржаўнай дзейнасці.

Былы батрак, дэмабілізаваны чырвоны камандзір, Нікалай Іванавіч Грыбаедаў выбіраецца жыхарамі сваёй роднай вёскі Масюкі членам, а затым старшынёй сельсовета. Тры гады ён працуе на гэтым пасту. Наступныя 13 год ён на кіруючай раённай совецкай рабоце. Спачатку Нікалай Іванавіч працуе загадчыкам райфінаддзела, а затым — старшынёй райвыканкома Аршанскага і іншых раёнаў Віцебскай вобласці. Ён накаплівае велізарны жыццёвы вопыт; партыя, членам якой ён састаіць з 1927 года, выхоўвае яго,



кіруе ім і адкрывае перад ім усё шырэйшыя гарызонты.

Сярод таварышоў, мабілізаваных ЦК КП(б)Б у памятныя вераснёўскія дні 1939 года, знаходзіцца Нікалай Іванавіч Грыбаедаў. Разам з Чырвонай Арміяй пераходзіць ён граніцу, якая на працягу дваццаці год аддзяляла дзве часткі адзінай зямлі.

Але як адрозніваецца Заходняя Беларусь ад Усходняй! Шэрыя хаткі з саламянымі стрэхамі, вузенькія палоскі сялянскай зямлі, цемра і галеча працоўнага сялянства а побач — асадніцкія хутары і шырока рассеўшыяся памешчыцкія двары. Нікалай Іванавіч успамінае родныя Масюкі такімі, якія яны былі да 1917 года. Ён разумее: тут трэба многа і ўпорна папрацаваць, каб узняць жыццё народа да ўзроўню Совецкай Беларусі.

І Нікалай Іванавіч Грыбаедаў з галавой уходзіць у новую работу. Ён назначаецца старшынёй часовага ўпраўлення горада Гродна, дзе дапамагае Чырвонай Арміі ў справе ачышчэння горада ад польскіх афіцэраў і жандараў. Некалькі дзён пазней, яго пераводзяць далей на захад, у Саколку.

Ён—старшыня Часовага ўпраўлення Саколкаўскага павета. Спаць прыходзіцца на падлозе, на шынелі. Няма часу пад'есці. Няма адбою ад наведвальнікаў. Прыходзяць сяляне, у якіх польская армія забрала коней. Трэба ім дапамагчы, трэба навесці парадак у горадзе, трэба накарміць насельніцтва, бо прыватныя гандляры закрылі свае крамы.

Бясконныя сяляне атрымліваюць коней. Яны атрымліваюць таксама памешчыцкіх кароў і, зразумела, зямлю. Арганізуецца малацьба хлеба ў панскіх гумнах, частка яго раздаецца батракам, жыхары Саколкі маюць ужо хлеб, Саколка адной з першых у вобласці накіроўвае вагоны хлеба ў Беласток.

У лютым 1940 года Нікалай Іванавіч Грыбаедаў працуе ўжо намеснікам старшыні Беластоцкага аблвыканкома. Ён апраўдвае сябе і на гэтым пасту. Вопыт ён мае, бо ён вырас з нізоў і прайшоў усе звенні совецкай работы ў сяле і раёне. Былы батрак, бальшавік, які са зброяй у руках змагаўся з контррэвалюцыяй у годы грамадзянскай вайны і вёў барацьбу з кулацтвам у годы калектывізацыі, валодае вялікім і патрэбным у нашых умовах вопытам работы.

Нікалай Іванавіч займаецца ў аблвыканкоме справамі сельскай гаспадаркі, загатоўкамі і дарожным будаўніцтвам. Наша вобласць мае ў гэтых галінах немалыя дасягненні.

Работу Нікалая Іванавіча ацанілі рабочыя і сяляне нашай вобласці. Працоўныя Саколкаўскага раёна выбралі яго дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Рабочыя, служачыя і сяляне Свіслацкай выбарчай акругі № 82 вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Увесь яго жыццёвы шлях — шлях батрака, байца і камандзіра Чырвонай Арміі, бальшавіка, кіруючага совецкага работніка — даказвае, што ён з чэсцю апраўдае аказанае яму давер'е.

**М. Новагрудскі.**

***Выбаршчыкі Харашчанскай выбарчай акругі № 22! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Аляксандра Фёдаравіча АКУЛІЧА!***

★ ★ ★

## Аляксандр Фёдаравіч Акуліч

(***БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС***)

Ля балоцістай лагчыны, акружаная з усіх бакоў шырокімі пладароднымі чарназёмамі кулакоў і памешчыкаў Саматыга, ютілася калісьці бедная беззямельная вёска Астраў. Тут сярод поўгалоднай сельскай бедняты самай няшчаснай была сям'я Фёдара Акуліча.

У гэтай сям'і, не маючай нічога, акрамя старой згніўшай хаты, Аляксандр Фёдаравіч Акуліч быў 12-ым едаком па ліку.

Дзесяцігадовым хлопчыкам Аляксандр Фёдаравіч пайшоў працаваць да шаўца. Аб вучобе ў школе і марыць не было чаго. Трэба было як-небудзь прахарчавацца. Гэта было галоўнае. Так ішлі годы галечы і пакут. На першых парах была якая-небудзь работа на навакольных кулацкіх хутарах. Але потым яе не стала. Прышлося, надзеўшы торбу, узяўшы малаток, нож і драўляныя калодкі, накіравацца за дзесяткі кіламетраў у вёскі іншых раёнаў на пошукі работы.

Аднойчы, рамантуючы абутак у далёкім сяле, т. Акуліч сустрэў чырвонаармейцаў. Яны паглядзелі на яго рослую, каранастую постаць і параілі паступіць добраахвотна ў Чырвоную Армію. Гэтая парада зрабіла свой ўплыў. У гэтым-жа годзе Акуліч паступае добраахвотнікам у Чырвоную Армію. З гэтага і пачалося яго новае жыццё.

Цяжка было на першых парах непісьменнаму хлопцу авалодваць ваеннай справай.

Але настойлівасць, дапамога палітрука часці і камандзіра сказаліся. Малады баец хутка паступіў у палкавую школу. Школа аставіла свой след на ўсё жыццё. Тут ён стаў пісьменным чалавекам і ўступ-



піў у члены бальшавіцкай партыі.

Уходзячы ў 1926 годзе з Чырвонай Арміі ў доўгатэрміновы водпуск, тав. Акуліч быў пасланы на работу загадчыка народным домам соцкультуры ў Старыя Дарогі. Адтуль у 1929 годзе паступіў у Ленінградскі інстытут шляхоў зносін. Вучыўся да 1932 года. Пасля сканчэння інстытута, да 1937 года працаваў на пабудовах дарог і раду адказных аб'ектаў. З 1937 па 1939 год тав. Акуліч працуе ў якасці старшыні Бабруйскага райвыканкома.

У верасні 1939 года доблесныя часці Чырвонай Арміі па загаду Совецкага ўрада перайшлі былую дзяржаўную граніцу СССР з Польшчай. ЦК комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі тав. Акуліча накіроўвае на работу ў Заходнюю Беларусь. Ён прыязджае ў Беласток і працуе старшынёй Беластоцкага райвыканкома. Працоўныя Беластоцкага раёна добра ведаюць тав. Акуліча. Ён бывае ў сельскіх советах, у вёсках, гутарыць з калгаснікамі, з сялянамі-аднаасобнікамі, дапамагае арганізаваць новае жыццё.

Працоўныя раёна дабіліся ўжо немалых поспехаў. Прадукцыя прамысловых прадпрыемстваў значна павялічылася ў параўнанні з мінулым. Арганізавана 3 калгасы. Калгасы паспяхова справіліся з выкананнем гаспадарча-палітычных задач, якія стаялі перад імі ў гэтым годзе. У раёне арганізаваны 3 бальніцы, 12 хат-чытален, машынна-трактарная станцыя.

Бясспрэчна, што немалая заслуга ў гэтым і тав. Акуліча, як кіраўніка раёна. Рабочыя і сяляне паважаюць яго за дапамогу, за чэснасць і прамату, за бальшавіцкую прынцыповасць.

Выбаршчыкі Харашчанскай выбарчай акругі № 22 у дзень выбараў 15 снежня ўсе аднадушна аддадуць свае галасы за кандыдатуру Аляксандра Фёдаравіча Акуліча, кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

**А. Аляксандраў.**



На здымку: кандыдаты ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных (злева направа) тт. М. І. Цэнтнершвер, Я. І. Івашчук, А. І. Дзержынскі і Н. Г. Ляндау.

Фота А. Сапіра.

# *Кандыдаты ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных*

## Наталья Гецэлеўна Ляндау

— Што-б ні здарылася, я павінна быць мастаком! — так не раз таварыла сваім таварышам Наталья, будучы яшчэ вучаніцай сярэдняй школы ў Варшаве.

І за ажыццяўленне свайго жадання яна змагалася сама. Бацька, які з'яўляўся бедным служачым адной з варшаўскіх кантор, нічым не мог дапамагчы сваёй дачцы. Зарабляемых грошай ледзь хапала на харчаванне. Займаючыся ў сярэдняй школе, Наталья, дзякуючы сваім здольнасцям, змагла даваць прыватныя ўрокі па некаторых дысцыплінах.

Было цяжка, але-ж школу ў 1928 годзе яна скончыла паспяхова і ў 1929 годзе паступіла ў мастацкае вучылішча.

Увесь час і вучылася і працавала.

Мастацкае вучылішча ў 1933 годзе таксама скончыла паспяхова.

— Не, гэта яшчэ не ўсё! — заяўляла яна. — Каб стаць сапраўдным мастаком, трэба яшчэ многа вучыцца.

Паступае ў Варшаўскую акадэмію мастацтваў. Напрагае ўсе свае сілы, каб добра асвоіць графіку...

1939 год застаў Наталью Гецэлеўну ў горадзе Роўна. Тут-жа яна сустрэла Чырвоную Армію. І толькі ў гэтыя дні Наталья ўпэўнілася, што яе мара канчаткова ажыццёўлена, што перад ёй адкрылася сапраўдная дарога ў жыццё. Там-жа Наталья Гецэлеўна арганізуе саюз работнікаў мастацтва.

4 студзеня 1940 года тав. Ляндау пераязджае ў Беласток і прыступае да самай актыўнай работы ў саюзе мастакоў. За чэсную, добрасумленную работу мастакі Беластока пасылаюць Наталью Гецэлеўну Ляндау ў Маскву на нараду работнікаў графікі. Зараз яны вылучылі яе кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета па выбарчай акрузе № 165.

## Максіміліян Ісідаравіч Цэнтнершвер

Максіміліян Ісідаравіч нарадзіўся ў 1889 годзе ў сям'і служачых. Бацька бесперапынна 40 год працаваў на адным заводзе ў Варшаве ў якасці галоўнага бухгалтара. Маці была хатняй гаспадыняй, яна мела сярэднюю асвету і многа часу ўдзяляла выхаванню сваіх дзяцей.

Максіміліян рос і развіваўся, як гаварылі, не па днях, а па часах. Будучы гімназістам, ён у 1905 годзе прымае ўдзел у школьнай забастоўцы, накіраванай супроць нацыянальнага і соцыяльнага прыгнечання.

З ранніх год Максіміліян праяўляе выключную цікавасць да музыкі. У прафесара Лота навучаецца скрыпцы. Адначасова займаецца жывапісам і маляваннем у майстэрні прафесара Герштэйна.

Калі Максіміліян Ісідаравіч становіцца самастойным, ён выязджае ў 1907 годзе ў Парыж, дзе працягвае вучобу. Авалодванне любімымі навукамі праходзіць паспяхова. Звярнуўшыся ў Варшаву пасля 1917 года, ён працягвае работу над сабой. Ім напісана некалькі музычных твораў.

Вучобу і работу ў галіне музыкі і мастацтва Максіміліян Ісідаравіч працягваў разам са сваёй жонкай настойліва і сур'ёзна. Але з-за цяжкіх матэрыяльных умоў прышлося навуковую работу некалькі закінуць. Тав. Цэнтнершвер стаў рэцэнзентам адной яўрэйскай газеты, а потым — карэспандэнтам нямецкага і французскага музычных журналаў. Год праз 10 зноў атрымалася некаторая магчымасць узяцца за вучобу і работу па спецыяльнасці.

Але-ж не надоўга. Яго польскія ўлады пачалі ўсяляк праследваць, як яўрэя. Пры велізарных цяжкасцях яму ўдалося разам з іншымі таварышамі арганізаваць «Яўрэйскае музычнае таварыства» і наладзіць яго работу.

Максіміліян Ісідаравіч добра ведаў, што ёсць СССР і што там работнікі ўсіх спецыяльнасцей маюць шырокі прастор для сваёй дзейнасці. Ён не раз думаў аб тым, каб перабрацца ў Совецкі Саюз. Гэту мару тав. Цэнтнершвер змог ажыццявіць, калі ў верасні 1939 года Чырвоная Армія вызваліла працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Максіміліян Ісідаравіч прыбыў у совецкі Беласток.

Новае жыццё пачалося ў яго. Ён атрымаў магчымасць шырока праявіць свае здольнасці і веды па любімай спецыяльнасці.

Калектыў Беластоцкай музычнай школы, дзе ён працуе педагогам, вылучыў тав. Максіміліяна Ісідаравіча Цэнтнершвера кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па выбарчай акрузе № 167.

## Антон Іванавіч Дзержынскі

Простая і кароткая яго біяграфія. Ён не ведае старога, праклятага жыцця. Нарадзіўшыся ў 1918 годзе, Антон рос і выхоўваўся ва ўмовах совецкай улады.

Бацька Антона да Кастрычніцкай рэвалюцыі быў грузчыкам на чыгунцы, пры совецкай уладзе некаторы час працаваў у якасці вартаўніка, а з 1924 года да смерці (1930 год), як інвалід працы, знаходзіўся на ўтрыманні дзяржавы. У сям'і Дзержынскіх у тыя дні працавалі: маці — краўчыхай і старэйшы брат —качагарам на фанерным заводзе.

У 1933 годзе Антон скончыў няпоўную сярэднюю школу. Праз некаторы час паступае ў Віцебскі механіка-энергетычны палітэхнікум. Па сканчэнні тэхнікума, у красавіку 1938 года, Антон пачынае свой працоўны шлях, маючы ўжо званне тэхніка-электрыка.

20-гадовы юнак, паляк па нацыянальнасці, паступае на віцебскую акулярнавую фабрыку, дзе працуе ў якасці электратэхніка да верасня 1939 года.

Тав. Дзержынскі — член ВЛКСМ з 1937 года. І гэтае званне ён з чэсцю апраўдвае. Яго лічаць лепшым электратэхнікам у горадзе, адным з лепшых грамадскіх працаўнікоў.

Вось чаму ў верасні 1939 года ЦК ЛКСМБ накіраваў тав. Дзержынскага на работу ў Беластоцкую вобласць. Некалькі месяцаў ён быў упаўнаважаным павятовага Часовага ўпраўлення па Трасцянскай гміне. Потым яго накіравалі на Беластоцкую гарадскую электрастанцыю для работы па спецыяльнасці. На электрастанцыі ў якасці загадчыка лабараторыі ён працуе і зараз. Працуе добрасумленна, па-комсамольску. Таму рабочыя электрастанцыі і вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета па 164-й выбарчай акрузе.

## Яніна Іванаўна Івашчук

Яніна Іванаўна Івашчук нарадзілася ў 1921 годзе. Ёй толькі нядаўна споўнілася 18 год. Але-ж яна ўжо многае перажыла, бо расла і выхоўвалася ва ўмовах панскай Польшчы.

Бацька Яніны — стары рабочы, паляк, з сіл выбіваўся, каб пракарміць сваю невялікую сям'ю. Сродкаў для вучобы дачкі не хапала, прыходзілася падрабляць і мацеры. Яшчэ горш пайшло жыццё Яніны з 1932 года, калі памёр бацька. З-за адсутнасці работы для мацеры яны пакінулі сваё мястэчка Цэханавец і пераехалі ў Беласток.

Але і ў Беластоку было не лепш. Маці мыла бялізну. Яніна з вялікімі цяжкасцямі закончыла 7-гадовую школу. А ў 1938 годзе пачала працаваць прадаўшчыцай у магазіне фірмы Бегскок.

— Не хацела быць прадаўшчыцай у купцоў, — расказвае яна. — Мяне цягнула на прадпрыемства. Але на фабрыках нехапала работы. Прышлося ўстройвацца там, дзе было месца.

Аднак і ў магазіне, на той рабоце, якую яна не паважала, доўга працаваць не прышлося. Яніну гаспадар звольніў. З ранняга ўзросту яна ўлілася ў рады беспрацоўных.

Ад гора і пакут збавіла Яніну, як і мільёны іншых працоўных, Чырвоная Армія ў верасні 1939 года.

Яніна Іванаўна Івашчук атрымала работу. Некаторы час яна працавала ў беластоцкім універмагу, а з ліпеня 1940 года—работніцай Беластоцкай скургалантарэйнай фабрыкі. Яе, як адну з лепшых стаханавак, скора вылучаюць на пасаду бракаўшчыцы.

Рабочымі і служачымі скургалантарэйнай фабрыкі Яніна Іванаўна Івашчук вылучана кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета і зарэгістрыравана для балатыроўкі па выбарчай акрузе № 166.

**В. Дзям'янаў.**

Лесазагатоўкі і лесавывазкі

# СЛОВЫ І СПРАВЫ

ГРОДНА. (**Па тэлефону ад нашага карэспандэнта**).

Гродненскі раён з квартала ў квартал не выконвае плана загатоўкі і вывазкі лесу. У 4-м квартале раён павінен вывезці 14 тысяч кубаметраў і вырубіць 9 тысяч кубаметраў лесу. Прэзідыум райвыканкома некалькі дзён таму назад на пасяджэнні, на якім прысутнічалі многія старшыні сельсоветаў, абмяркоўваў пытанне загатовак і вывазак лесу. Выступаючым старшыням сельсовета нечага было сказаць, бо яны не займаліся загатоўкамі і вывазкамі. Тут-жа было ўзята абавязацельства да 1-га снежня выканаць план.

Што-ж паказваюць справы? Ход работы па загатоўках гаворыць аб тым, што ўзятыя абавязацельствы астаюцца на паперы. За імі не паследавала канкрэтная работа. Да першага снежня асталося толькі тры дні, а план лесазагатовак выканан усяго на 31 процант, а па вывазцы —на...7 процантаў. Давездзеныя да сельсоветаў графікі лесазагатовак і вывазкі сарваны. Некаторыя сельсоветы, як, напрыклад, Гібуліцкі (старшыня тав. Мукасей), Агародніцкі (старшыня тав. Бараноўскі) і іншыя да гэтага часу не вывезлі і не загатовілі ні аднаго кубаметра лесу, і гэта ў той час, калі лесаўчастак ад іх знаходзіцца зусім блізка. Верцялішскі сельсовет (старшыня тав. Волкаў) выканаў квартальны план лесавывазак... на 3 проценты.

Не паляпшаюцца справы з загатоўкай і вывазкай і ў апошнія дні. 22-га лістапада па ўсяму раёну на вывазку лесу выязджала толькі 7 падвод, якія вывезлі 3 кубаметры. 23-га лістапада на вывазцы было 25 падвод. Вывезена 24 кубаметры лесу.

Так у Гродненскім раёне выконваюць узятыя абавязацельствы па загатоўцы і вывазцы лесу.

**Г. Лупсякоў.**

# Партыйнае жыццё

## СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫЯ ПАРТСХОДЫ Ў ВОІНСКІХ ЧАСЦЯХ

### Выдатныя вынікі работы

Партыйная арганізацыя Н-скай часці правяла велізарную работу па мабілізацыі комуністаў і ўсяго асабістата састава на выдатнае аўладанне баявой і палітычнай падрыхтоўкай. Партыйная арганізацыя з дня ў дзень мацавала аўтарытэт камандзіра, паднімала на яшчэ вышэйшую ступень боездольнасць часці.

Днямі ў тэтай партыйнай арганізацыі адбыўся справаздачна-выбарчы сход. У сваім дакладзе сакратар партбюро тав. Рыжкоў і выступаўшыя ў спрэчках комуністы адзначалі сапраўды авангардную ролю комуністаў — у дасканалым авалоданні баявой і палітычнай падрыхтоўкай.

У арганізацыі 64 процанты комуністаў маюць выдатныя паказчыкі ў рабоце. 79 процантаў членаў і кандыдатаў партыі прэміраваліся і адзначаліся камандаваннем за прыкладнасць і ўзоры ў вучобе і рабоце.

Партыйная арганізацыя выхавала ў сваіх радах такіх комуністаў-лётчыкаў, як тт. Кукушкіна, Пракопава, Крутаверцава, Калеснікава, Кудрашова і іншыя, якія па-большэвіцку працуюць над павышэннем сваіх ведаў, у дасканаласці валодаюць майстэрствам лётнай справы. Сваім асабістым прыкладам комуністы вядуць за сабой увесь састаў часці.

Вялікае майстэрства ў рабоце па падрыхтоўцы самалётаў да палёту паказвае і тэхнічны састаў. Гэта—тэхнікі-комуністы тт. Балдзіцын, Казакоў, Смірноў і іншыя. Усе яны выдатна працуюць на матэрыяльнай часці баявых машын. Абслугоўваемыя імі самалёты ў любую мінуту гатовы да выканання баявога задання.

Такіх поспехаў партыйная арганізацыя дабілася дзякуючы добра пастаўленай палітыка-выхаваўчай работы.

Для дапамогі самастойна вывучаючым «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» за параўнаўча кароткі адрэзак часу зроблена 4 даклады, прачытана 47 лекцый, 57 кансультацый і таварыскіх субяседванняў. У выніку большасць комуністаў заканчвае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» па сярэдняму звяну. Яны працуюць над XI і XII раздзеламі падручніка.

Партыйная арганізацыя сваёй работай аказала вялікую дапамогу камандаванню ў добрай арганізацыі баявой вучобы. Увесь асабісты састаў гатоў па першаму клічу партыі і ўрада выступіць на абарону свяшчэнных рубяжоў нашай радзімы.

Малодшы палітрук **Н. Кочкін.**

### Высокая арганізаванасць

Роўна ў 5 гадзін вечара сакратар партбюро Н-скай часці тав. Акімаў далажыў, што ўсе комуністы ў поўным зборы.

Хутка, але без спешкі, з захаваннем поўнай партыйнай дысцыпліны сход выбірае дзелавы прэзідыум і адразу-ж прыступае да абмеркавання першага пытання павесткі дня.

Палітрук тав. Акімаў у добра падрыхтаваным дакладзе расказаў партыйнаму сходу пра тое, як партбюро і партарганізацыя ў цэлым змагалася за выкананне сваіх адказных задач.

— У сваёй практычнай выхаваўчай рабоце,—гаворыць тав. Акімаў,—партарганізацыя ў часці кіравалася гістарычнымі рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б), загадамі і ўказаннямі народнага камісара абароны СССР, маршала Савецкага Саюза тав. Тімашэнка, змагалася за ўзорнае выкананне загадаў камандзіра часці аб баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

У дакладзе тав. Акімаў прыводзіць многа фактаў, якія гавораць аб тым, што комуністы займаюць авангардную ролю ў справе далейшага падняцця баявой магутнасці падраздзяленняў часці.

Комуністы-курсанты школы тт. Падабуеў, Мацакоў, Кібалеў і іншыя здалі экзамен на «добра» і «выдатна». Працуючы ў падраздзяленнях у якасці малодшых камандзіраў, яны высокасвядома адносяцца да даручанай ім справы, з'яўляюцца важакамі соцыялістычнага спаборніцтва.

Комуністы тт. Жук, Юдзін, Саланін, Літоўчанка, Снісар, два браты Валошнікавы адзначаны камандаваннем як лепшыя людзі часці і імі заслужана гардзіцца партарганізацыя, выхаваўшая іх.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Адзін за другім да трыбуны падыходзяць комуністы і па-большэвіцку крытыкуюць недахопы ў рабоце партбюро, уносяць каштоўныя прапановы па паляпшэнню пастаноўкі партыйнай работы.

40 процантаў прысутнічаючых выступілі ў спрэчках. Асабліва змястоўнымі былі выступленні камандзіра таварыша Шуцікава, тт. Каліўкіна, Даніліна і іншых. Іх прапановы ляглі ў аснову пастановы партсхода, якая дала новаму саставу партбюро баявую праграму дзейнасці па далейшаму паляпшэнню партыйнай работы.

У састаў бюро выбраны лепшыя комуністы часці.

Партсход быў сапраўднай школай выхавання комуністаў.

Палітрук **П. Чыкун.**



Комсамольцы Бабруйскага машынабудаўнічага завода імені Сталіна рыхтуюць малаткі, вугальнікі, унутрамеры і іншыя інструменты для рамесленага вучылішча металістаў у г. Бабруйску. Злева направа: слесары-комсамольцы Н. К. Кулько і А. Н. Ларыкаў за работай.

Фотахроніка БЕЛТА.

Фота М. Шкляра

### Узорна наладзіць учот членаў і кандыдатаў комсамола

КНЫШЫН. **(Ад нашага карэспандэнта).** У пярвічных комсамольскіх арганізацыях Кнышынскага раёна праходзяць агульныя комсамольскія сходы, прысвечаныя абмеркаванню інструкцыі ЦК ВЛКСМ «Аб учоце членаў і кандыдатаў ВЛКСМ». На гэтых сходах комсамольцы актыўна, па-дзелавому ўскрываюць недахопы ў пярвічных арганізацыях і намячаюць канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню справы ўчоту ў сваіх арганізацыях.

Актыўна, пры 100-процантнай яўцы комсамольцаў прайшоў сход у пярвічнай арганізацыі мястэчка Ганіендз. Даклад аб учоце комсамольцаў зрабіла член райкома комсамола тав. Зысман. Затым сакратар пярвічнай арганізацыі тав. Хмялеўскі падрабязна далажыў аб становішчы комсамольскай гаспадаркі ў сваёй арганізацыі. На сходзе былі выкрыты факты неахайных адносін да комсамольскай гаспадаркі. Пратаколы пярвічнай арганізацыі афармляюцца дрэнна, а некаторыя з іх падоўгу астаюцца неафармленымі. Акрамя таго, тут яшчэ не заведзен учот усіх членаў арганізацыі.

Агідна адносіцца да комсамольскай гаспадаркі сакратар пярвічнай арганізацыі раённага аддзела НКУС (Народны камісарыят унутраных спраў) тав. Федасееў. Ёсць вялікая задоўжанасць па членскіх узносах. Парушан парадак учоту. Ён без ведама райкома комсамола прымаў на ўчот комсамольцаў, а іх асабістыя справы захоўваў у сябе. Аб 6 такіх комсамольцах, якія прыбылі ў арганізацыю, райкому комсамола не было вядома.

На праводзімых сходах комсамольцы ўносяць рад каштоўных прапаноў і патрабуюць ад сваіх кіраўнікоў, каб у комсамольскай гаспадарцы быў наведзен належны парадак.

### *Шклодувы*

Аб мінулым рабочыя ўспамінаюць вельмі неахвотна — гаротнае было жыццё. Гаспадар завода імкнуўся пабольш атрымаць прыбытку і таму на ўмовы працы рабочых не звяртаў увагі. Рабочыя на кожным кроку цярпелі ад майстраў здзекі, лаянку. Майстар абыходзіўся з рабочымі, як з жывёлай. Шклодува Уладзіслава Кахановіча майстар кінуў у чан з вадой.

У верасні 1939 года над заводам узвіўся чырвоны сцяг. Гаспадарамі завода сталі рабочыя. Чырвоная Армія прынесла новае жыццё. Шклодува Уладзіслава Кахановіча, які працуе на гэтым заводзе з 1922 года, вылучылі начальнікам змены. Аб гэтым пры капіталістах ён не мог нават і марыць.

18 год прапрацаваў на заводзе шклодувам Антон Пташкоўскі. Ён разам з Кахановічам быў актыўным удзельнікам забастоўкі ў 1932 годзе. Пташкоўскага Антона дырэкцыя таксама вылучыла начальнікам снабжэння і збыту. Ён палюбіў новую работу і добра з ёю спраўляецца.

Вера Хамко працавала сартыроўшчыцай бутэлек. Аднойчы яе паклікаў да сябе дырэктар завода.

— Тав. Хамко, мы думаем Вам даць больш адказную работу, — сказаў дырэктар.

— Жанчыне адказную работу? — недаверліва прагаварыла Вера. — Можа, не спраўлюся? — дадала яна.

З ёй пагаварылі, і яна згадзілася ўзяцца за новую работу. Веру назначылі начальнікам склада гатовых вырабаў. З новай работай яна спраўляецца нядрэнна. Гатовая прадукцыя ў складзе знаходзіцца заўсёды ва ўзорным парадку.

Атрымаў новую работу Уладзіслаў Мілючэнка. Яго вылучылі начальнікам змены. Да гэтага ён працаваў чорнарабочым. Змена тав. Мілючэнка паказвае добрыя ўзоры работы. Начальнікам змены назначан шклодуў Вячэслаў Тарасевіч.

Калектыў шклозавода рыхтуе дастойную сустрэчу дню выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельства да 15 снежня выканаць гадавую вытворчую праграму. Узятыя абавязацельствы падмацоўваюцца канкрэтнымі справамі. Брыгада майстра Афанасія Міскаўца сістэматычна выконвае заданне на 110—120 процантаў. Брыгада выдувальшчыкаў майстра Івана Баярчыка штодзённа перавыконвае вытворчае заданне. Добра працуюць брыгады Міхаіла Макарэвіча і Франца Балдыгі.

Кастрычніцкі план завод перавыканаў, выпусціўшы 120 тысяч бутэлек звыш плана. За 10 месяцаў і 25 дзён лістапада завод даў звыш 7 мільёнаў бутэлек. Гадавы план выканан ужо на 95 процантаў. З кожным днём усё шырэй разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва паміж зменамі і асобнымі рабочымі за дастойную сустрэчу дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

**Г. Майскі.**

Гродненскі шклозавод.



Новы калгасны пасёлак сельгасарцелі імені С. М. Кірава (Віцебскі раён), пасля ссялення хутароў. Дамы калгаснікаў і вуліца электрафіцыраваны.

Фота І. Лосева — Фотахроніка БЕЛТА.

### Першая калгасная восень

У трох кіламетрах ад мястэчка Рось размясцілася невялічкая вёска Карпаўцы. У мінулым яна нічым не адрозніваласа ад іншых вёсак Заходняй Беларусі. Жыхары яе з года ў год цярпелі здзекі, нястачу. Абсеўшы з усіх бакоў, памешчыкі і асаднікі, як павукі, смакталі пот і кроў беднякоў і серадня коў вёскі. З ранку да позняй ночы сяляне працавалі на дармаедаў. Большая палавіна жыхароў вёскі не магла забяспечыць свае сем'і прадуктамі харчавання нават на поўгода.

Толькі з устанаўленнем совецкай улады сяляне вёскі змаглі выправіць згорбленую спіну ад паднявольнай працы, уздыхнуць поўнымі грудзьмі, стаць поўнаўладнымі гаспадарамі свайго жыцця.

За год жыцця ў дружнай сям'і вялікага совецкага народа пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі адбыліся карэнныя змяненні. З жабрацкай аднаасобнай гаспадаркай, з вузенькімі палоскамі, зарослымі бур'янам, жыхары вёскі пакончылі раз і назаўсёды. Яны сталі на калгасны шлях жыцця.

З ранняй вясны на шырокім калгасным полі закіпела дружная работа. Калгаснікі па-большэвіцку змагаліся за атрыманне высокага ўраджаю. Чэсная работа дала свае рэзультаты. За ўсё жыццё ў Карпаўцаў гэтая восень—першая багатая восень. Ураджай вырас на славу. Разлічыўшыся з дзяржавай па абавязковых пастаўках, натураплаце за работу машынна-трактарнай станцыі, засыпаўшы насенныя, страхавыя і фуражныя фонды, на кожны працадзень прыпадае па 7 кілаграмаў зернавых і каля 15 кілаграмаў бульбы.

Сям'я калгасніка Аляксандра Сямёнавіча Зыбко на свае працадні за 7 месяцаў атрымала авансам 3 тоны зернавых і больш 6 тон бульбы. Калгаснік Аляксандр Філіпавіч Вераціла атрымлівае 2,8 тоны зернавых, 6 тон бульбы. Столькі хлеба яны маюць упершыню за ўсё сваё жыццё, калі жылі на аднаасобнай гаспадарцы.

Старшыня калгаса тав. Васілеўскі заклапочан: тры свірны перапоўнены хлебам, няма дзе ссыпаць зярно. Ён аб гэтым штодзённа напамінае калгаснікам і прапануе атрымаць прылічваючаеся зярно на працадні. Але многія калгаснікі не бяруць збожжа таму, што і ім няма, дзе ссыпаць. Калі раней працавалі на аднаасобнай гаспадарцы, то асабліва вялікіх засекаў для збожжа не трэба было.

«Дзе дзяваць збожжа?» — такое пытанне зараз паўстала перад былой бядначкай Анастасіяй Касіла. Яна адна выпрацавала 200 працадзён і атрымае 1,4 тоны зернавых, 3 тоны бульбы. На прапанову праўлення атрымаць збожжа, Анастасія з радаснай усмешкай заяўляе:

— Дзе я яго ў сваёй хацінцы змяшчу? Столькі хлеба!

Такое-ж пытанне паўстала і перад калгаснікам Осіпам Белаблоцкім. Яго свіран аказаўся малы, каб умясціць усё збожжа, якое ён атрымлівае на працадні. Осіп Белаблоцкі атрымлівае 2,4 тоны зярна і 5,2 тоны бульбы.

Перад калгасам вялікая перспектыва росту грамадскай гаспадаркі, росту заможнасці калгаснікаў. Праўленне і калгаснікі рашылі шырока развіваць садоўніцтва, жывёлагадоўлю, пчалаводства і гародніцтва. Днямі ў калгасе закончана пасадка пладовага саду на 5 гектараў.

Грамадскае стада калгаса зараз складае 22 галавы буйнай рагатай жывёлы, 23 авечкі і 5 свіней. Да канца 1941 года калгаснікі мяркуюць мець 50 дойных кароў, каля 100 свінаматак і патроіць стада авец. Вялікая перспектыва развіцця пчалаводства ў калгасе. Пасека зараз налічвае 37 пчола-сем'яў.

Кіруе калгасам былы бядняк, Антон Варфаламеевіч Васілеўскі. Калгаснікі аказалі яму высокае давер'е, вылучыўшы яго кандыдатам у дэпутаты раённага Совета. Каласнікі ўпэўнены, што тав. Васілеўскі будзе верна служыць свайму народу. Ён прыкладзе ўсе свае здольнасці к таму, каб калгас «Большэвік» быў перадавым у раёне.

**Д. Казлоў.**

Ваўкавыскі раён.

На міжнародныя тэмы

## АГЛЯД ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПАМІЖ ІТАЛІЯЙ І ГРЭЦЫЯЙ

**(З 28 кастрычніка па 23 лістапада)**

28 кастрычніка, як вядома, пачаліся ваенныя дзеянні паміж Італіяй і Грэцыяй.

Італія сканцэнтрыравала ў Албаніі 9 армію ў саставе да 12 дывізій, у тым ліку адну горную і адну механізіраваную, агульнай колькасцю каля 200.000 чалавек. Ад партоў Дурацо, Валона і Санты-Кваранта былі пракладзены да албана-грэчаскай граніцы аўтамабільныя шасейныя дарогі. На найбольш небяспечных участках, у прыватнасці ў раёне Корчы, былі пабудаваны доўгачасовыя ўмацаванні.

Грэчаскае камандаванне ў сваю чаргу пабудавала ўздоўж усёй граніцы з Албаніяй па лініі Фларына, Касторыя, Грэвена, Мецавон, Яніна, Пірамідзя сетку доўгачасовых умацаванняў. Аднак гэтыя ўмацаванні не ішлі суцэльнай лініяй па ўсяму фронту, а ўтваралі асобныя ўмацаваныя раёны на найбольш важных напрамках. Асабліва моцна былі ўмацаваны раён Фларыны, Касторыя і раён Яніны. Астатнія ўчасткі прыкрываліся асобнымі фортамі і ўмацаваннямі палявога тыпу. На граніцы было сканцэнтрыравана 7 — 8 дывізій агульнай колькасцю ў 160 — 180 тыс. чалавек.

Тэатр, на якім разгарнуліся ваенныя дзеянні, характарызуецца горным, моцна перасечаным рэльефам мясцовасці і адсутнасцю на грэчаскай тэрыторыі дастатковай колькасці выгодных дарог.




Па характару мясцовасці фронт дзеліцца на тры сектары: паўночны, македонскі сектар ад возера Малая Прэспа да Эрсеке; цэнтральны сектар — Пінд — ад Эрсеке да Останіца; сектар Эпіра — ад Останіца да ўзбярэжжа праліва Корфу. Найбольшае значэнне мае паўночны сектар. Групіроўка сіл на фронце к пачатку ваенных дзеянняў была, мяркуючы па паведамленнях друку, наступнай: паўночны сектар — 3 італьянскія дывізіі супроць 4—5 грэчаскіх дывізій; цэнтральны сектар — 2 італьянскія дывізіі (горная і 19 пяхотная) супроць адной грэчаскай дывізіі; паўднёвы сектар — 2 італьянскія дывізіі супроць 1—2 грэчаскіх дывізій.

Апрача таго, у раёне Тэпелене італьянцы сканцэнтрыравалі механізіраваную дывізію (каля 250 танкаў) і 2 кавалерыйскія палкі ў якасці рэзерва. У выпадку прарыву грэчаскіх умацаванняў гэтыя часці павінны былі развіваць поспех у напрамку на Салонікі. Па характару мясцовасці танкі не маглі быць скарыстаны для прарыву.

Ваенныя дзеянні можна разбіць на 2 фазы.

Першая фаза, з 28 кастрычніка па 3 лістапада, характарызавалася некаторым поспехам італьянскіх войск у цэнтральным і паўднёвым сектарах. Італьянская альпійская дывізія быстра прасоўвалася ўперад у напрамку Коніца, Грэвена, прабуючы выйсці ў тыл грэчаскім умацаванням у раёне Касторыя. Да 3 лістапада гэтая дывізія пранікла на 30 клм. углыб грэчаскай тэрыторыі і дасягнула населеных пунктаў Самарына, Дыстратон. У сектары Эпіра італьянскія войскі таксама быстра пачалі прасоўвацца ўперад і да 3—4 лістапада падышлі да перадавых грэчаскіх пазіцый, прыкрываючых горад Яніна. Частка італьянскіх сіл фарсіравала раку Каламас і замацавалася на яе левым беразе, з цяжкасцю адбіваючы жорсткія контратакі грэчаскіх войск.

Інакш развіваліся дзеянні ў Македонскім сектары. Пасля атак у напрамку Фларыны і Касторыя італьянскія часці адышлі на албанскую тэрыторыю і замацаваліся на вышынях Марава і на Іван-гары і гары Звязда. Грэчаскія войскі перайшлі ў контратаку, але поспеху не мелі. Італьянская авіяцыя бамбардыравала стратэгічныя пункты ўнутры Грэцыі, а таксама парты, перашкаджаючы дастаўцы ў Грэцыю зброі і боепрыпасаў.

З 4 лістапада пачалася другая фаза ваенных дзеянняў. Грэчаскія войскі, атрымаўшы падмацаванні ў колькасці да двух дывізій, перайшлі ў контратаку па ўсяму фронту.

У Македонскім сектары значныя сілы грэкаў праніклі па вузкаму перашэйку паміж азёрамі Малая і Вялікая Прэспа і перайшлі ў наступленне на Корчу з поўначы, перарэзаўшы дарогу Паградзец —Корча. Адначасова ўзмацніўся націск на італьянскія пазіцыі на вышынях Марава. Італьянскае камандаванне пачало спешна падкідваць падмацаванні ў раён Корчы. Дзейны ўдзел у адбіцці грэчаскіх атак пачала прымаць авіяцыя. Да 400 італьянскіх самалётаў штодзённа бамбардыравалі і штурмавалі грэчаскія войскі. Але ўсё-ж грэкі захвацілі пануючыя над Корчай вышыні Марава і з блізкай дыстанцыі абстрэльвалі горад. Італьянскае камандаванне аддала загад аб адступленні з Корчы на паўночны-захад.

У сектары Пінд, атрымаўшы падмацаванне, грэчаскія войскі раптоўна атакавалі з флангаў і тыла асобныя калоны італьянскай горнай дывізіі і акружылі іх. Высланыя на дапамогу кавалерыйскія і мотацыклетныя часці і часці 19 пяхотнай дывізіі былі адбіты. У выніку 10-дзённых баёў італьянскія часці адышлі на свае заходнія пазіцыі. Горная і 19 пяхотная дывізіі панеслі вялікія страты. У сектары Эпір у выніку жорсткіх контратак грэчаскіх войск італьянцы пачалі павольны адыход да сваіх зыходных пазіцый.

Падзенне Корчы прадвызначыла становішча на ўсіх астатніх участках фронта. Грэкі атрымалі магчымасць выйсці ў фланг і тыл італьянскіх войск, дзеючых у сектарах Пінд і Эпір.

Італьянскае камандаванне 21 лістапада аддала загад аб адыходзе войск, рашыўшы адыйсці на другую лінію абароны з тым, каб падцягнуць падмацаванні і перагрупіраваць свае сілы. На фронт спешна перакідваюцца войскі з Італіі і фарміруецца новая 11 армія.

Капітан **Н. Андрэеў.**

### Пасадка садоў у калгасах

Ваўкавыскі райземаддзел закупіў 3.600 штук пладовых саджанцаў для пасадкі садоў у калгасах. У садова-агароднай арцелі імені Тэльмана, Ваўкавыскага горвыканкома, пасаджана 3 гектары пладовага саду, у калгас імені Сталіна, Вярэйкаўскага сельсовета, таксама пасаджана 3 гектары. Па 2 гектары пасаджана ў калгасе імені Будзённага, імені Молатава і «Большэвік».

У кожным калгасе раёна будзе пасаджана ад 3 да 5 гектараў пладовага саду.

### Кадры для МТС

Абласным зямельным аддзелам накіроўваюцца зараз 48 трактарыстаў МТС нашай вобласці на 6-месячныя курсы брыгадзіраў у Мсціслаўль і Крычаў. Частка з іх ужо выехала на месца вучобы.

Адначасова выслана 15 брыгадзіраў МТС у Рагачоў на паўтарагадовыя курсы механікаў. У бліжэйшыя дні выедзе яшчэ 9 чалавек.

## *У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ*

### СТАНОВІШЧА У РУМЫНІІ.

БУХАРЭСТ, 28 лістапада. (ТАСС). Усе газеты змяшчаюць камюніке совета міністраў па повадў расстрэла групай легіянераў 64 палітычных дзеячоў, зняволеных у ваеннай турме Жылава. У камюніке паведамляецца, што ўрад асуджае гэты акт і што вінаўнікі яго будуць пакараны.

Газеты публікуюць таксама афіцыяльную заяву намесніка прэм'ера Хорыа Сіма, у якой гаворыцца, што «ад гэтага часу кожнае парушэнне палітычнай лініі, устаноўленай кіраўніком дзяржавы і легіянерскім рухам, будзе карацца бязлітасна і ў адпаведнасці з асобымі законамі».

Паведамляюць, што акрамя асоб, расстраляных у ноч на 27 лістапада ў ваеннай турме Жылава, учора было расстраляна яшчэ некалькі былых румынскіх дзяржаўных дзеячоў. Сярод іх — былы міністр, генеральны сакратар нацыянальнай сялянскай партыі Маджэару.

БУХАРЭСТ, 28 лістапада. (ТАСС). Як сцвярджаюць у журналісцкіх кругах, паміма расстрэла 64 палітычных дзеячоў, зняволеных у турме Жылава, учора мелі месца тэрарыстычныя акты ў правінцыі.

Учора-ж жалезнагвардзейцамі быў забіт прафесар гісторыі, былы каралеўскі саветнік і прэм'ер-міністр 1931—1932 года Іорга. Ён быў удзень арыштаван, а ўвечары труп яго знайшлі ў прыдарожнай канаве каля Плоешты.

У дзень 27 лістапада на адной з вуліц Бухарэста групай легіянераў быў гвалтоўна ўсажан у аўтамабіль і ўвезен у невядомым напрамку бліжэйшы памочнік Маніу, сакратар партыі нацыянал-царанiстаў, прафесар палітычнай эканоміі Маджэару. Сёння яго ізуродаваны труп быў знойдзен у лесе на ўскраіне Бухарэста.

Перадаюць, што з апасення тэрарыстычных актаў супроць Жыгурту, Татарэску, Раля, Аржэтояну і раду іншых членаў былога ўрада апошнія ўтрымліваюцца пад спецыяльнай ахоўай.

Перад дамамі некаторых вядомых грамадскіх дзеячоў — Маніу, Дзіну Брацiану і іншых выстаўлена ваенная ахова.

Становішча ў Бухарэсце напружанае. Па вуліцах патрулiруюць танкі, ваенныя атрады і атрады жалезнай гвардыі, адданыя кіраўніку легіянерскага руху Хорыа Сіма.

—o—

### БАЛГАРСКАЕ АБВЯРЖЭННЕ

Па просьбе балгарскай місіі ў Маскве публікуем наступнае балгарскае абвяржэнне:

«Балгарскае тэлеграфнае агенцтва перадае з Сафіі, што распаўсюдзіўшыяся за граніцай, галоўным чынам у Бухарэсце і Белградзе, чуткі аб смутах у Балгарыі, аб змене ўрада і аб увядзенні ваеннага становішча ў краіне з'яўляюцца тэндэнцыёзнымі і спачатку да канца выдуманымі. Ва ўсёй Балгарыі—упаўне спакойна». (ТАСС).

—o—

### ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

ЛОНДАН, 28 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у сектары Пагрaдзеца грэкі занялі вёску Чэрова, якая мае важнае стратэгічнае значэнне, і прасунулі свае пазіцыі к поўначы ад Москополе.

## *ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА*

ЛОНДАН, 28 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, англійская авіяцыя зрабіла паспяховы налёт на Валону. Зарэгістрыравана прамое пападанне бомб у стаячы ў парту вялікі параход. Значны ўрон прычынен докам, разбурана частка ўзбярэжнай, а таксама пабудовы паблізу ангара. Адзін непрыяцельскі знішчальнік збіт. Англійская авіяцыя абстраляла калоны адступаючых італьянскіх войск у раёне Тэпелене (Албанія). Праціўнік панёс вялікія страты.

Англійская авіяцыя за час вайны ў Грэцыі збіла 20 італьянскіх самалётаў. Намеснік міністра авіяцыі заявіў, што пасля таго, як 19 лістапада 8 італьянскіх самалётаў былі збіты англійскімі знішчальнікамі, непрыяцельская авіяцыя ўхіляецца ад боя з англійскімі самалётамі.

НЬЮ-ЙОРК, 28 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, прадстаўнік грэчаскага ўрада заявіў, што наступленне грэчаскіх войск праходзіць здавальняюча.

Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс, грэкі адбілі дзве італьянскіх атакі на поўдзень ад Москополе. Англійскія самалёты бамбардыравалі дарогу на поўнач ад г. Пагрaдзец. Грэчаскія войскі пасля сражэння, у якім яны страцілі 72 чалавекі забітымі і 50 раненымі, занялі вёску Дракова. За апошнія два дні грэкі прасунуліся ў гэтым сектары на 6 міль.

* * *

Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, у камюніке вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі гаворыцца, што самалёты праціўніка бамбардыравалі пункты ў раёне Эпіра і на астравах Корфу, Кефалінія і Крыт. Бамбардыроўцы падвергся таксама горад Патры. Маюцца афяры сярод грамадзянскага насельніцтва. Разбурана некалькі дамоў.

Італьянцы бамбардыравалі Фларыну і пазіцыі грэкаў у раёне Москополе. Два італьянскіх самалёты збіты.

БЕЛГРАД, 28 лістапада. (ТАСС). Газета «Палітыка» паведамляе: сітуацыя на фронце амаль не змянілася. Італьянцы на некаторых участках працягваюць адступаць па прадугледжанаму плану.

У Тырану прыбыў начальнік італьянскага генеральнага штаба маршал Бадольо. У сувязі з гэтым у Тыране адбываецца важная нарада па арганізацыі італьянскага контрнаступлення.

## Баі на італа-грэчаскім фронце

БЕЛГРАД, 28 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Палітыка» паведамляе з Салонік, што, «па звестках з фронта, грэчаскія войскі зноў перайшлі ў наступленне. У радзе месц адбыліся сутычкі, якія закончыліся ў карысць грэкаў. Наступленне працягваецца. На працягу ўчарашняга дня італьянскія самалёты чацверты раз бамбардыравалі горад Ліксурыон на востраве Кефалінія, а таксама некаторыя сёлы ў Эпіры. Маецца некалькі афяр. Матэрыяльны ўрон нязначны. Італьянцамі бамбардыраван востраў Корфу. Рэзультаты гэтай бамбардыроўкі пакуль невядомы. Англійская авіяцыя напала ўчора на італьянскія матарызаваныя калоны паблізу Эльбасана».

## Італьянскія абвяржэнні

РЫМ, 28 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Стэфані, італьянскія аўтарытэтныя кругі абвяргаюць распаўсюджанае лонданскім радыё паведамленне, у якім сцвярджаецца, што ў Індыйскім акіяне англійскія самалёты атакавалі італьянскія ваенныя караблі і патапілі адзін авіяносец, а таксама сур'ёзна пашкодзілі два іншых караблі. Гэтыя кругі ўказваюць, што на гэтых днях у Індыйскім акіяне не было ніякага сражэння паміж англійскімі самалётамі і італьянскімі ваеннымі караблямі і што Італія наогул не мае авіяносцаў.

Акрамя таго, катэгарычна абвяргаецца перадаанае лонданскім радыё паведамленне грэчаскага радыё аб прасоўванні грэчаскіх войск на 30 міль к захаду ад г. Пагрaдзец, а таксама паведамленне аб тым, што грэкі карыстаюцца ў Албаніі танкамі, пакінутымі італьянцамі пры адступленні. Грэкі, указвае агенцтва, захапілі толькі невялікія загароды з калючага дроту.

## *Італьянская зводка*

РЫМ, 28 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Стэфані перадае наступную зводку італьянскага камандавання: «Учора на грэчаскім фронце часці 11-й арміі разгарнулі ў некалькіх пунктах паспяховыя контратакі. Дзве паветраныя эскадры ў складзе некалькіх сот самалётаў удзельнічалі ў контратаках у цесным узаемадзеянні з наземнымі сіламі. Акрамя таго, гэтыя паветраныя эскадрыллі падвергли бамбардыроўцы наступныя аб'екты праціўніка: аэрадром у Козані, дзе было знішчана 9 самалётаў, аэрадром у Фларыне, дзе спалена 5 знішчальнікаў; бамбардыроўцы падвергся таксама вакзал Фларыны. Усе нашы самалёты звярнуліся на базы.

Адно з нашых марскіх злучэнняў, крэйсіруючы на поўдзень ад Сардыніі, увайшло ў дакрананне з англійскай эскадрай, накіроўваўшайся з захаду. Гэта эскадра састаяла з некалькіх лінкораў, аднаго авіяносца і вялікай колькасці крэйсераў. Уступіўшы ў бой, нашы караблі пашкодзілі адзін крэйсер тыпа «Кент» і адзін крэйсер тыпа «Бірмінгам». Адзін з снарадаў праціўніка папаў у наш крэйсер «Фіуме», але не ўзарваўся. Адзін з нашых эсмінцаў «Ланчыерэ» быў сур'ёзна пашкоджан і адведзен на буксіры на базу. Зенітная артылерыя нашых караблёў збіла два самалёты праціўніка. Некаторыя з нашых груп бамбардыроўшчыкаў дзейнічалі ў суправаджэнні знішчальнікаў. Бомбамі буйнага калібру былі пашкоджаны 1 авіяносец, 1 лінкор і 1 крэйсер. Паследаваўшая паветраная разведка ўстанавіла, што лінкор, на барту якога ўспыхнуў пажар, спыніўся».

## *АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА*

### Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 28 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі:

Дальнабойныя батарэі германскай марской артылерыі зноў абстралялі скапленні суднаў у парту Дуўра. Працягваючаеся неспрыяючае надвор'е значна абмежавала дзеянні авіяцыі. Не гледзячы на гэта, у ноч на 27 лістапада і ўдзень 27 лістапада германскія бамбардыроўшчыкі скінулі бомбы над Лонданам і Эвонмутам. Адзін германскі бамбардыроўшчык з брыючага палёту атакаваў ваенны завод паблізу Бэрнтайленд. 3 скінутых бомб 2 папалі ў адзін з буйных цэхоў.

Мінулай ноччу англійскія самалёты, зрабіўшыя налёт на заходнюю Германію, скінутымі бомбамі прычынілі пашкоджанні некалькім жылым дамам. Сярод грамадзянскага насельніцтва налічваецца 4 забітых і некалькі раненых. Збіта 4 непрыяцельскіх самалёты. 5 германскіх самалётаў прапалі без весткі.

### Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 28 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ў ноч на 28 лістапада германская авіяцыя зрабіла налёт на горад у Паўднёва-Заходняй Англіі, на Лондан і яго ваколіцы. Над Лонданам непрыяцельскія самалёты паяўляліся на працягу ўсёй ночы. Ад бамбардыроўкі пацярпелі жылыя дамы і складскія памяшканні, у якіх узніклі пажары. Матэрыяльны ўрон нязначны. Акрамя таго, германскія самалёты бамбардыравалі асобныя пункты ў Цэнтральнай і Усходняй Англіі, а таксама ў паўднёва-ўсходняй Шатландыі. Матэрыяльны ўрон і афяры нязначныя. На працягу ночы быў збіт адзін непрыяцельскі бамбардыроўшчык.

—o—

### ПЛЫВУЧЫЯ СХОВІШЧЫ ДЛЯ ЛЁТЧЫКАЎ ЗБІТЫХ ГЕРМАНСКІХ САМАЛЁТАЎ

ЛОНДАН, 28 лістапада. (ТАСС). Англійская газета «Дэйлі экспрэс» змясціла апісанне плывучых сховішч, расстаўленых немцамі ў праліве Ла-Манш паблізу французскага ўзбярэжжа для ратавання лётчыкаў збітых германскіх самалётаў. Дуўрскі карэспандэнт «Дэйлі экспрэс» дае чарцёж такога сховішча і поўнае яго апісанне, дадаючы, што некалькі такіх сховішч было вылоўлена англічанамі. Плывучыя сховішчы маюць цыліндрычную форму і ўзвышаюцца над вадой толькі на 4 футы. На вяршыне цыліндра маецца маленькая вежа канічнай формы з вочкам. Па знешняму выгляду гэтыя сховішчы напамінаюць буі. Размеры сховішча — 10 футаў у дыяметры і 15 футаў у глыбіню. Германскія лётчыкі, аказаўшыяся паблізу такога сховішча, могуць узабрацца на яго з дапамогай умацаванай з боку стальной лесенкі. Унутр пранікаюць з дапамогай люка, які напамінае люк падводных лодак. Унутры сховішча знаходзяцца 4 койкі з пасцельнымі прыладамі, скрынка з медыкаментамі і адзежай, радыё-абсталяванне і кансервіраваныя прадукты. Месцапалажэнне сховішч указана на марскіх картах, якімі забяспечаны германскія лётчыкі.



На здымку: Дзеці ў дзіцячым садзе №12 пры 2-м Беластоцкім тэкстыльным камбінаце.

Фота А. Сапіра.

## *Пісьмы ў рэдакцыю*

### Звярнуць школе двор

Яўрэйская школа № 10 у Беластоку заўсёды мела прасторны двор, на якім дзеці гулялі ў час перапынкаў.

Па суседству са школай знаходзіцца мэблевая фабрыка. Па загаду дырэктара горпромкамбіната, у веданні якога знаходзіцца фабрыка, непасрэдна ля школы пабудаван паркан, і ўвесь школьны двор такім чынам уключан у тэрыторыю мэблевай фабрыкі. Супраціўленне дырэктара школы такому незаконнаму дзеянню аказалася зусім безрэзультатным.

600 дзяцей асталося без двара, і яны вымушаны праводзіць перапынкі ў школьных сценах і не маюць магчымасці падыхаць свежым паветрам і праводзіць фізкультурныя заняткі.

Адбыўшыйся 24 лістапада сход бацькоў, на якім прысутнічала 300 чалавек, патрабаваў ад гарадскога выканаўчага камітэта вырашэння гэтага пытання. Мы лічым, што двор, які заўсёды належаў школе і які неабходны для дзяцей, павінен быць неадкладна звернут школе.

Бацькоўскі камітэт: **Я. Б. Кругля, Д. Х. Гурвіч, А. Ц. Баярскі, Р. Героўская** і іншыя (усяго 12 подпісаў).

### Уцягнуць у грамадскую работу лепшых стаханаўцаў

Загадчык базы Крынкаўскага райспажыўсаюза тав. Мілешка якімсьці чынам у сваёй асобе аб'яднаў наступныя грамадскія абавязкі: старшыні мясцкома, рэдактара насценнай газеты, старшыні расцэначна-канфліктнай камісіі. І вось прфсаюз не працуе, насценгазета не выдаецца, а няправільнае зняцце з работы таго ці іншага работніка некаму абскардзіць.

Асобныя работнікі за 5—6 месяцаў работы яшчэ не ўступілі ў прфсаюз, работнікі прылаўка не могуць атрымаць патрэбнай ім спецвопраткі. Начальнік гандлёвага аддзела райспажыўсаюза тав. Кастрыцкі да работнікаў прылаўка адносіцца дрэнна, усім пагражае судом, замест таго, каб выхоўваць людзей.

Неабходна ў работу мясцкома рэдкалегіі і расцэначна-канфліктнай камісіі ўцягнуць лепшых стаханаўцаў і ўдарнікаў прылаўка.

**Е. Левін.**

г. Крынкі.

### Безгаспадарчасць на Гродненскім велазаводзе

На гродненскім веласіпедным заводзе абыякава адносяцца да гатовай прадукцыі. Завод выпрабляе прыгожыя дзіцячыя веласіпеды і каляскі. Але захоўваць тут іх не ўмеюць. Усе цэхі завалены каляскамі і веласіпедамі. Склада няма. Прадукцыя псуецца.

Акрамя гэтага загружанасць цэхаў гатовай прадукцыяй не дае магчымасці нармальна працаваць заводу. На пытанне, чаму не прадаюцца дзіцячыя каляскі і веласіпеды, дырэктар завода адказвае: «Няма зацверджаных цэн».

На заводзе не рэалізавана на 100 тысяч рублёў гатовай прадукцыі.

**Б. Русакоў.**

### *ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ*

Ад грамадзяніна Е. З. Фаменка намі было атрымана пісьмо, у якім паведамлялася, што ў лабараторыі першай гарадской паліклінікі догляд за хворымі не знаходзіцца на належнай вышыні.

Як паведамілі з 1-й паліклінікі, факты, адзначаныя ў пісьме Фаменка, поўнасцю падцвердзіліся.

Загадчыка лабараторыі ўрача Навагрудскага, як незабяспечыўшага нармальнай работы ў лабараторыі, з пасады знялі. Загадчыкам лабараторыі назначана тав. Малевіч. Паліклінікай прынят рад канкрэтных мерапрыемстваў для лепшага абслугоўвання наведвальнікаў.

Адказны рэдактар
**Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ**




**Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.**

УБ—111 Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруку.